# Агляд Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе» (2022)

2022

## УВОДЗІНЫ

1 верасня 2022 года набылі моц нормы новага Закона Рэспублікі Беларусь № 175-З «Аб дзяржаўнай службе», які быў прыняты 1 чэрвеня 2022 года.

У адрозненне ад Закона Рэспублікі Беларусь 2003 года «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» ад 14 чэрвеня 2003 г. (далей — Закон 2003 года), Закон Рэспублікі Беларусь № 175-З «Аб дзяржаўнай службе» ад 1 чэрвеня 2022 г. (далей - Закон 2022 года) складаецца з 11 Раздзелаў (супраць 10 у ранейшым Законе), падзеленых на 79 артыкулаў (супраць 64 у ранейшым Законе), і дадатку. У Законе 2022 года з'яўляюцца 2 новыя раздзелы: «Грамадзянская служба» і «Асаблівасці паступлення, праходжання і спынення грамадзянскай службы, а таксама дысцыплінарнай адказнасці асоб, якія займаюць грамадзянскія пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь». Раздзел «Прызначэнне і выплата пенсій дзяржаўным службоўцам, фінансаванне выдаткаў на іх выплату» ў Законе 2022 года адсутнічае.

З 13 прынцыпаў Закона 2003 года ў новы Закон практычна без зменаў перайшлі 10; прынцып «галоснасці» заменены на прынцып «адкрытасці і празрыстасці»; дададзены прынцып «эфектыўнасці»; прынцыпы «гуманізму і сацыяльнай справядлівасці», «адзінства сістэмы дзяржаўнай службы і яе дыферэнцыяцыі ў адпаведнасці з канцэпцыяй падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую», «добраахвотнасці паступлення грамадзян на дзяржаўную службу» не знайшлі адлюстравання ў сістэме прынцыпаў Закона 2022 года. Выключэнне такіх прынцыпаў, як «галоснасць», «гуманізм і сацыяльная справядлівасць», «адзінства сістэмы дзяржаўнай службы і яе дыферэнцыяцыя ў адпаведнасці з канцэпцыяй падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую», «добраахвотнасць паступлення грамадзян на дзяржаўную службу», на наш погляд, паказваюць на дадзены сістэме дзяржаўнай службы вектар на ажыццяўленне дзяржаўнаўладных паўнамоцтваў паводле вызначанага вертыкаллю сцэнара. Прынцып падзелу ўлад страчвае значэнне, знікае магчымасць свабодна выказваць асабістую думку.

## СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНАЙ СЛУЖБЫ: ТЭРМІНАЛОГІЯ І ПАНЯТКІ

Азначэнні дзяржслужбы ў абодвух дакументах практычна супадаюць, але Законам 2022 года прадугледжана забеспячэнне выканання функцый не толькі дзяржорганамі, але і службовымі асобамі. Гэта значыць, заканадаўча замацавана тое, што і так з'яўляецца бясспрэчным: дзяржслужбовец заўсёды прадстаўляе дзяржорган і сам мае пэўныя паўнамоцтвы, але ў межах паўнамоцтваў гэтага органа.

Адно з асноўных наваўвядзенняў Закона 2022 года — гэта тое, што дзяржслужба прадстаўлена ў выглядзе адзінай сістэмы, якая падзяляецца на тры віды: дзяржаўную грамадзянскую службу, вайсковую службу і службу ў ваенізаваных арганізацыях, да якіх

належыць, напрыклад, Следчы камітэт, органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю і інш.

Таксама Закон 2022 года замацоўвае панятак сістэмы дзяржслужбы і паняткі кожнага віду дзяржслужбы — грамадзянскай, вайсковай і ваенізаванай (арт. 4-6 Закона 2022 года). У прыватнасці, дзяржаўная грамадзянская служба — гэта від дзяржслужбы, які ўяўляе сабой прафесійную дзейнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь на дзяржаўных грамадзянскіх пасадах, а таксама на вайсковых пасадах, якія маюць быць замененымі афіцэрамі, і пасадах сярэдняга, старэйшага і найвышэйшага начальніцкага складу, калі іх займаюць у вызначаным заканадаўствам парадку дзяржаўныя грамадзянскія службоўцы ў дзяржорганах (арт. 4 Закона 2022 года). Панятак дзяржаўнай пасады ў Законе 2022 года акрэслены з улікам відаў дзяржслужбы ў Беларусі (п. 2 арт. 8). Артыкулам 8 вызначаны пасады, якія належаць да найвышэйшых дзяржаўных пасад. Іншыя ключавыя паняткі, якія ўжываюцца ў гэтым законе («дзяржорган», «дзяржслужбовец»), прынцыпова не змяніліся (арт. 7-9 Закона 2022 года). Варта адзначыць, што ранейшы Закон аб дзяржслужбе не змяшчаў падрабязнай рэгламентацыі дзяржслужбы паводле яе віду.

Што да панятку «кадравы рэестр», у новым законе канкрэтызавана, што гэта не проста сістэма ўліку (пералік) кіраўнічых пасад, але «сістэма ўліку (пералік) кіраўнічых пасад, для якіх вызначаны асобны парадак падбору, у тым ліку адмысловыя патрабаванні да справавых і асобасных якасцей, прызначэння (вызвалення)» (п. 1 арт. 11 Закона 2022 года). Пунктам 4 арт. 11 устаноўлена, што Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь вызначае пералік пасад кіраўнічых працаўнікоў дзяржаўных органаў, уключаных у кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, якія падлягаюць медычнаму агляду падчас назначэння на пасаду, а таксама арганізацыю аховы здароўя, у якой праводзяцца медагляд, медычна-сацыяльная экспертыза.

Парадак фармавання і праверкі звестак аб кандыдатах на пасады, уключаныя ў кадравыя рэестры (п. 2 арт. 12) аддадзены для зацвярджэння Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь (у Законе 2003 года асноўны парадак фармавання кадравага рэестра і праверкі звестак усё ж быў вызначаны). Таксама ў новы Закон не ўвайшоў вельмі важны, на наш погляд, прынцып, які павінен быць замацаваны заканадаўча, як гэта было ў ранейшым Законе): «падчас фармавання звестак аб кандыдатах на дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравыя рэестры, забараняецца збор інфармацыі аб асабістым жыцці кандыдатаў або чальцах іхніх сем'яў, іншых блізкіх сваякоў, а таксама звестак аб іхнім веравызнанні і прыналежнасці да палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, апрача выпадкаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі».

Азначэнне дзяржаўнай грамадзянскай пасады і пералік органаў, у якіх такія пасады прадугледжаны, змяшчаюцца ў арт. 14 Закона 2022 года. Аднак пералік з 10 пунктаў не закрыты, бо ў яго ўваходзяць і іншыя органы. У звязку з гэтым могуць узнікаць праблемы з даказваннем знаходжання на дзяржслужбе.

Разам з тым, дзеянне Закона 2022 года, як і раней, датычыць пераважна грамадзянскіх дзяржаўных службоўцаў і не распаўсюджваецца, за выняткам агульных нормаў закона (Раздзел 1 Закона 2022 года), на асоб, якія праходзяць вайсковую службу і службу ў ваенізаваных арганізацыях. Дзейнасць апошніх, як і раней, рэгулюецца нормамі адмысловых НПА, якія замацоўваюць іхні прававы статус (п. 2 арт. 10 Закона 2022 года).

## РЭЕСТР ПАСАД І КЛАСЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ СЛУЖБОЎЦАЎ

Закон 2022 года прадугледжвае абноўленую сістэму класаў для дзяржаўных грамадзянскіх службоўцаў. Паводле яе, кожнай грамадзянскай пасадзе мае адпавядаць адзін пэўны клас грамадзянскіх службоўцаў (п. 1 арт. 17 Закона 2022 года). Для грамадзянскіх службоўцаў таксама ўводзіцца найвышэйшы клас, падзелены на тры рангі, а таксама дзевяць класаў, з якіх дзявяты клас найніжэйшы (п. 2 арт. 17 Закона 2022 года). Гэта дазволіць дыферэнцыяваць класы дзяржслужбоўцаў паводле ступені напружанасці працы і адказнасці. Для параўнання: Закон 2003 года ўстанаўліваў найвышэйшы клас і 12 класаў, найніжэйшым з якіх быў 12-ты клас (п. 2 арт. 11 Закона 2003 года).

Акрамя службовага пасведчання, дзяржаўнаму грамадзянскаму службоўцу будзе выдавацца нагрудны знак (п. 2. арт. 19 Закона 2022 года).

Наданне класаў дзяржаўным грамадзянскім службоўцам, якія займаюць адпаведныя пасады ў дзяржоргане на 01.01.2023, а таксама падчас паступлення службоўца на дзяржаўную грамадзянскую пасаду будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з:

- рэестрам грамадзянскіх пасад;
- прыраўноўваннем або суаднясеннем класаў, вызначаных у падпп. 2.2 і 2.3 п. 2 Указа № 195, калі клас дзяржаўнага службоўца (класавы чын, персанальнае званне, дыпламатычны ранг, кваліфікацыйны клас) прыраўноўваецца (суадносіцца) да найвышэйшага класа дзяржаўнага грамадзянскага службоўца ў параўнанні з класам, вызначаным у Рэестры (3.3 п. 3 Указа № 195).

Суаднясенне класаў пададзена ў табліцы:

| Клас дзяржслужбоўца да 01.01.2023 | Клас дзяржаўнага грамадзянскага службоўца |
|---|---|
| Найвышэйшы — у асоб, якія займаюць (займалі) найвышэйшую дзяржаўную пасаду | Найвышэйшы клас 1-га рангу |
| Найвышэйшы | Найвышэйшы клас 2-га рангу |

| | |
|---|---|
| 1 | Найвышэйшы клас 3-га рангу |
| 2 | Першы |
| 3 | Другі |
| 4 | Трэці |
| 5 | Чацвёрты |
| 6 | Пяты |
| 7 | Шосты |
| 8 | Сёмы |
| 9 | Восьмы |
| 10 | Дзявяты |
| 11 | Дзявяты |
| 12 | Дзявяты |

## ПРЫЁМ НА ДЗЯРЖСЛУЖБУ І ВЫЗВАЛЕННЕ АД ДЗЯРЖСЛУЖБЫ

Артыкул 29 Закона 2022 года змяшчае (у адрозненне ад ранейшага закона) адкрыты пералік дакументаў, якія могуць быць запатрабаваны для паступлення на дзяржаўную службу. Законам 2022 года (арт. 34) пашыраны пералік падстаў, з якімі не ўводзіцца папярэдняе выпрабаванне падчас паступлення на дзяржаўную службу; тэрмін папярэдняга выпрабавання падчас прыёму на дзяржаўную службу скарочаны да трох месяцаў (раней папярэдняе выпрабаванне доўжылася ад трох да шасці месяцаў).

Таксама заўважым, што Закон 2022 года прапануе некаторыя новаўвядзенні датычна кантрактаў дзяржслужбоўцаў. Калі Закон 2003 года прадугледжвае 5 пунктаў, якія вызначаюць змест гэтых дакументаў, адзначаючы, што іншыя ўмовы вызначаюцца пагадненнем бакоў (з улікам заканадаўства), то Закон 2022 года прадугледжвае 8 пунктаў, якія вызначаюць рэжым працы і адпачынку і аплату працы. Такім чынам, рэгуляванне гэтых прававых зносін уключана ў спецыяльнае заканадаўства аб дзяржслужбе нароўні з агульнымі нормамі, якія падпадаюць пад рэгуляванне працоўным заканадаўствам.

Таксама, у адрозненне ад Закона 2003 года, Закон 2022 года ўсталёўвае шырэйшы пералік падстаў для адмовы ў прыёме на дзяржслужбу. У прыватнасці, дадатковымі падставамі для адмовы ў прыёме на працу з'яўляюцца: наяўнасць грамадзянства (падданства) іншай дзяржавы, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь (п. 1.7 арт. 38); непадпісанне асобай абавязацельства

падпарадкоўвацца абмежаванням, прадугледжаным арт. 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змаганні з карупцыяй» (п. 1.10 арт. 38). Адзначым, што Закон 2022 года ў прынцыпе выключае магчымасць знаходжання на грамадзянскай службе асоб, якія маюць грамадзянства (падданства) іншай дзяржавы, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дамовамі, хаця раней Закон 2003 года забараняў гэта толькі асобам, у якіх адсутнічала грамадзянства Рэспублікі Беларусь (падп. 1.7 п. 1 арт. 33 Закона 2003 года).

Закон 2022 года ўводзіць з 1 верасня 2022 года забарону на прыём на грамадзянскую службу асоб, звольненых праз любыя дыскрэдытавальныя акалічнасці, на працягу двух гадоў пасля такога звальнення, а на грамадзянскія пасады, уключаныя ў кадравыя рэестры, на працягу пяці гадоў пасля такога звальнення, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (падп. 1.11 п. 1 арт. 38 Закона 2022 года). Поўны пералік дыскрэдытавальных акалічнасцей звальнення пададзены ў п. 6 Дэкрэта № 5[1].

П. 4 арт. 47 Закона 2022 года ўстаноўлены гранічны тэрмін — 5 гадоў — на які грамадзянскія службоўцы на пасадах, уключаных у кадравыя рэестры, якія дасягнулі гранічнага ўзросту знаходжання на грамадзянскай службе (65 гадоў), з іхняй згоды могуць быць пакінуты на грамадзянскай службе. Грамадзянскія службоўцы, назначаныя на грамадзянскія пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі гранічнага ўзросту знаходжання на грамадзянскай службе, з іхняй згоды могуць быць пакінуты на грамадзянскай службе на неабмежаваны тэрмін (п. 2 арт. 55 Закона 2022 года).

## КАДРАВЫ РЭЕСТР: АДМЕТНАСЦІ

Законам 2022 года ўведзены раздзел 7, які рэгулюе асаблівасці паступлення, праходжання і спынення грамадзянскай службы, а таксама дысцыплінарнай адказнасці асоб, якія займаюць грамадзянскія пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь (арт. 49-57). У ранейшым законе ўстанаўлівалася толькі тое, што Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь вызначае асаблівасці атэстацыі дзяржаўных службоўцаў, пасады якіх уключаны ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь.

Асобы, якія назначаюцца на грамадзянскія пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, падчас паступлення на грамадзянскую службу вызваляюцца ад праходжання конкурсу на адпаведную грамадзянскую пасаду, а таксама ад кваліфікацыйнага іспыту. Для ўказаных асоб не ўстанаўліваецца папярэдняе выпрабаванне. З асобамі, якія назначаюцца на грамадзянскія пасады Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, кантракт не заключаецца (арт. 50 Закона 2022 года).

[1] Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 снежня 2014 г. № 5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый».

Грамадзянскія службоўцы, якія займаюць найвышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, атрымліваюць дадатковыя паўнамоцтвы, а менавіта:

- даваць кіраўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый абавязковыя для разгляду даручэнні аб выпраўленні выяўленых недахопаў і аб прыцягненні да адказнасці асоб, якія іх дапусцілі;
- пры патрэбе браць удзел у пасяджэннях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, калегій дзяржаўных органаў і дзяржаўных арганізацый, каардынацыйных нарадах без дадатковага пацвярджэння сваіх паўнамоцтваў;
- прыцягваць да ўдзелу ў правядзенні асабістых прыёмаў грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, іншых сустрэч з насельніцтвам, калектывамі працаўнікоў, прэсавых канферэнцый прадстаўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дзяржаўных медыя, а таксама грамадскіх аб’яднанняў (арт. 51 Закона 2022 года).

## НЕНАРМАВАНЫ ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ

Закон 2022 года ўстанаўлівае для ўсіх грамадзянскіх службоўцаў ненармаваны працоўны дзень без давання дадатковага водпуску (п. 2 арт. 45). Выняткаў з гэтай нормы няма. Гэта значыць, што грамадзянскія службоўцы змогуць час ад часу па пісьмовым або вусным загадзе (распараджэнні), па пастанове наймальніка або з сваёй ініцыятывы з ведама наймальніка або ўпаўнаважанай службовай асобы наймальніка выконваць свае працоўныя абавязкі за межамі ўстаноўленай нормы працягласці рабочага часу. Варта адзначыць, што ненармаваны працоўны дзень для дзяржслужбоўцаў не згадваецца ні ў Палажэнні № 1271, ні ў шаблоне кантракта, у звязку з чым кантракты з дзяржслужбоўцамі давядзецца змяніць ў адпаведнасці з новым заканадаўствам (ч.4 арт. 19 Працоўнага кодэкса). Акрамя гэтага, для тых дзяржслужбоўцаў, у якіх раней не было ненармаванага працоўнага дня, яго ўвядзенне, на нашу думку, будзе зменай істотных умоў працы (ч.2 арт. 32 ПК).

## ГАРАНТЫІ МАТЭРЫЯЛЬНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

У пп. 2 і 3 арт. 60 замацоўваюцца дадатковыя гарантыі матэрыяльнага і сацыяльнага забеспячэння грамадзянскіх службоўцаў, а менавіта:

- прынясце грамадзянскіх службоўцаў на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, па месцы работы ў дзяржаўных органах у горадзе Мінску і населеных пунктах Мінскага раёна без уліку тэрміну працы

ў арганізацыях у названых населеных пунктах, калі для гэтага ёсць устаноўленыя заканадаўчымі актамі падставы;

- права на першачарговае атрыманння атрыманне дзяржслужбоўцамі арэнднага жытла згодна з пералікам дзяржаўных пасад, якія даюць права на атрыманне арэнднага жытла, што вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, на ўмовах і ў парадку, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Грамадзянскім службоўцам павялічана штомесячнае падвышэнне зарплаты – надбаўка за выслугу гадоў. У прыватнасці, для тых, хто мае стаж грамадзянскай службы ад 3 да 8 гадоў, падвышэнне складзе 25% разліковага службовага акладу (раней — 15%); ад 20 гадоў — 40% разліковага службовага акладу (раней — 30%).

Да спосабаў заахвочвання дзяржаўных службоўцаў дадалі меру «занясенне на Дошку гонару» і выключылі «датэрміновае наданне наступнага класа дзяржаўнага службоўца паводле займанай пасады» (п. 1 арт. 62 Закона 2022 года).

## СЛУЖБОВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА, АДКАЗНАСЦЬ І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ ДЗЯРЖСЛУЖБОЎЦАЎ

Раздзел 7 Закона 2022 года вызначае адмысловы парадак паступлення на дзяржслужбу, яе праходжанне і спыненне, а таксама дысцыплінарную адказнасць для асоб, якія займаюць грамадзянскія пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы.

Адметнай рысай новага закона з’яўляецца тое, што распрацоўнікі прапанавалі сістэмны падыход да заканадаўчага рэгулявання ўсіх відаў дзяржслужбы і набліжэнне патрабаванняў да арганізацыі працы грамадзянскіх службоўцаў к патрабаванням да арганізацыі працы службоўцаў Узброеных Сіл. У Законе 2022 года ўводзіцца азначэнне панятку службовай дысцыпліны (п. 1 арт. 72 Закона 2022 года). Таксама ўзмацняюцца патрабаванні да дысцыпліны і адказнасці грамадзянскіх службоўцаў.

Закон 2022 года ўводзіць такую новую меру дысцыплінарнага спагнання для дзяржслужбоўцаў, як строгая вымова (падп. 1.3 п. 1 арт. 73 Закона 2022 года). На практыцы яна і раней прымянялася да некаторых катэгорый дзяржслужбоўцаў — напрыклад, супрацоўнікаў Следчага камітэта (абз. 4 п. 19 Дысцыплінарнага статута Следчага камітэта), супрацоўнікаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз (абз. 4 п. 19 Дысцыплінарнага статута) — а ў дачыненні да некаторых іншых дзяржслужбоўцаў ўжывалася персанальна (абз. 3 п. 1 і абз. 3 п. 2 Указа № 502).

Закон 2003 года за невыкананне або неналежнае выкананне працоўных абавязкаў прадугледжваў шэсць мер дысцыплінарнага спагнання да дзяржслужбоўцаў: заўвага; вымова; папярэджанне аб няпоўнай службовай адпаведнасці; пазбаўленне цалкам або

часткова стымулявальных выплат на тэрмін да 12 месяцаў; паніжэнне ў класе дзяржслужбоўца на тэрмін да 6 месяцаў; звальненне з займанай пасады ў адпаведнасці з Законам 2003 года, ПК і іншымі заканадаўчымі актамі. У Законе 2022 года такіх мер таксама шэсць, але з яго выключана такая мера адказнасці, як паніжэнне ў класе дзяржслужбоўца на тэрмін да 6 месяцаў (п. 1 арт. 73 Закона 2022 года, п. 1 арт. 57 Закона 2003 года). Разам з тым, варта адзначыць, што спіс пералічаных мер не вычарпальны, бо захоўваецца права наймальніка прымяніць іншыя меры дысцыплінарнага спагнання, устаноўленыя заканадаўствам (п. 2 арт. 73 Закона 2022 года).

Для падтрымання ўзроўню прафесіяналізму грамадзянскіх службоўцаў у Законе 2022 года ўстаноўлена перыядычнасць павышэння кваліфікацыі або стажыровак. Згодна з агульным правілам, яны будуць праходзіць адзін раз на тры гады, але не радзей за адзін раз на пяць гадоў (п. 3 арт. 40 Закона 2022 года). Адзначым, што Закон 2003 года не змяшчаў гэтай нормы.

## ЭТЫЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ

Безумоўнае наваўвядзенне Закона 2022 года — гэта замацаванне агульных патрабаванняў да этычных паводзін грамадзянскіх службоўцаў (падп. 1.12 п. 1 арт. 25, падп. 2.2 п. 2 арт. 72, дадатак да Закона 2022 года). У дакуменце замацавана больш за 18 правіл службовых паводзін, якімі павінны кіравацца дзяржслужбоўцы незалежна ад займанай пасады. Таксама прадугледжваецца, што нават у пазаслужбовы час грамадзянскія службоўцы павінны трымацца высокіх маральных прынцыпаў і нормаў паводзін (п. 15 дадатку да Закона 2022 года). Акрамя гэтага, яны не павінны размяшчаць у асабістых акаўнтах у сацыяльных сетках інфармацыю, распаўсюджваць якую ў медыя забаронена, а таксама звесткі, якія могуць нанесці шкоду іхняй персанальнай рэпутацыі і аўтарытэту ўлады ў цэлым (п. 14 дадатку да Закона 2022 года).

## ВЫСНОВЫ

Нягледзячы на досыць вялікі аб'ём зменаў, уведзеных новым законам, усе яны неістотныя і не скіраваны на канцэптуальную змену сістэмы дзяржаўнага кіравання. Новы закон 2022 года не стаў сведчаннем пачатку развіцця сістэмы дзяржслужбы ў Беларусі ў бок сучасных тэндэнцый. Калі адна з галоўных такіх тэндэнцый — гэта пабудова дзяржаўнага кіравання, заснаванага на правах чалавека, эфектыўнасці, заахвочванні ініцыятывы і прафесіяналізму, заканадавец ідзе ў супрацьлеглы бок, абмяжоўваючы дзяржслужбоўцаў у праве на таямніцу асабістага жыцця, абарону персанальных звестак, свабоду меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выказванне.

Збліжэнне прынцыпаў нясення грамадзянскай і вайсковай службы, фактычнае аб'яднанне іх у адну сістэму, увядзенне панятку службовай дысцыпліны, выключэнне прынцыпу гуманізму і сацыяльнай справядлівасці — усе гэтыя змены яшчэ больш зводзяць функцыі дзяржслужбоўцаў да неабходнасці няўхільнага выканання рэгламентаў і загадаў, блакавання ініцыятывы. Сімвалічна і зніжэнне ўзроўню неабходнасці і працягласці выпрабавальнага тэрміну: фактычна гэта азначае зніжэнне патрабаванняў у ацэньванні прафесійных і асабістых якасцей дзяржслужбоўца. Такая змена, па-першае, з'яўляецца паказчыкам яшчэ большага зніжэння ўзроўню прэстыжу і даверу да сістэмы дзяржаўнага кіравання, а па-другое, разам з астатнімі фактарамі прывядзе да зніжэння якасці дзяржкіравання.